**Вабішчэвіч А.М.**

# ЗЯМЕЛЬНЫЯ ЎПРАЎЛЕННІ ПАЛЕСКАГА ВАЯВОДСТВА (1921–1939 ГГ.): ХАРАКТАРЫСТЫКА АРХІЎНЫХ ФОНДАЎ

Пасля ўключэння заходнебеларускіх зямель у склад Польшчы паводле Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. там была праведзена ўніфікацыя адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу з цэнтральнымі і заходнімі рэгіёнамі краіны. Тэрыторыя была падзелена на ваяводствы, якія складаліся з паветаў, а паветы – з гмінаў [2, с. 174].

Аграрнае пытанне для Заходняй Беларусі мела асаблівую вастрыню. Аграрная рэформа 1920-х гг. паспрыяла ліквідацыі прыгонніцкіх адносін, канцэнтрацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, стварала ўмовы для далейшага развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы, аднак радыкальнага вырашэння аграрнага пытання ў заходнебеларускім краі не адбылося [3, с. 357].

У папярэдніх публікацыях намі давалася характарыстыка ўсяму масіву архіўных дакументаў Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці (ДАБр), прысвечаных міжваеннаму часу (1919–1939 гг.) [1; 6]. Цяпер жа пастараемся прааналізаваць больш падрабязна толькі некалькі спецыялізаваных фондаў.

Для правядзення аграрнай рэформы 1920 г. у Польшчы ўводзіліся зямельныя ўпраўленні. Акрамя Галоўнага зямельнага ўпраўлення ў Варшаве, у ваяводствах былі створаны акруговыя зямельныя ўпраўленні, у паветах – павятовыя ўпраўлені, якія павінны былі кантраляваць рэалізацыю аграрнай рэформы на месцах. Да кампетэнцыі акруговых зямельных упраўленняў належалі пытанні ўрэгулявання ўжытку зямель, стварэння зямельнага рэзерву, выдання распараджэнняў аб парцэляцыі, камасацыі, асадніцтве, сервітутах, меліярацыі, аб выкананні рашэнняў Галоўнага зямельнага ўпраўлення і інш. Пры акруговых зямельных упраўленнях ствараліся акруговыя зямельныя камісіі – для вырашэння спрэчных пытанняў пры ўрэгуляванні ліквідацыі цераспалосіцы, замене зямель, ліквідацыі сервітутаў, прыняцця рашэнняў аб прымусовым выкупе зямельных маёнткаў, прызначаных для парцэляцыі, і інш.

Паводле распараджэння польскага ўрада 23 сакавіка 1921 г. была створана Палеская акруговая зямельная дэлегатура, якая 20 сакавіка 1922 г. была перайменавана ў Палескае акруговае зямельнае ўпраўленне, з 11 жніўня 1923 г. падпарадкавана Міністэрству сельскай гаспадаркі і зямельных рэформаў Польшчы. Распаўсюджвала сваю дзейнасць на тэрыторыі Палескага ваяводства. 17 лютага 1932 г. было скасавана, а яго функцыі перададзены Палескаму ваяводскаму ўпраўленню (аддзелу сельскай гаспадаркі) [4, с. 91–92].

Дакументы Палескага акруговага зямельнага ўпраўлення (на польскай мове) захоўваюцца ў ДАБр. Яны аб’яднаны ў адным вопісе фонда 60 і налічваюць 1472 адзінкі захавання. У 1944–1949 гг. адбылася сістэматызацыя дакументаў, у 1952 г. – навукова-тэхнічная апрацоўка спраў, складзены 4 вопісы, кароткая гісторыка-архіўная даведка, праведзена экспертыза каштоўнасці дакументаў. У 1956 г. перададзена на адкрытае захоўванне частка спраў у выніку мэтавага рассакрэчвання, у 1975 г. было ўдасканаленне вопісаў, створаны навукова-даведачны апарат. У 2007–2008 гг. адбылося ўдасканаленне і перапрацоўка вопісаў фонда, правядзена экспертызы каштоўнасці.

Сярод дакументальных матэрыялаў гэтага фонда знаходзяцца цыркуляры, распараджэнні, указанні Міністэрства сельскай гаспадаркі і зямельных рэформаў Польшчы, Галоўнага зямельнага ўпраўлення, пратаколы і рашэнні акруговай зямельнай камісіі, бюджэты, рашэнні Палескага акруговага зямельнага ўпраўлення аб арганізацыі камітэтаў па надзяленні зямлёй вайсковых і грамадзянскіх асаднікаў, продажы і перадачы ім зямельных участкаў, перапіска па фінансавых пытаннях, аб арэндзе дзяржаўных і прыватных зямель, аб выдачы грашовых пазык асаднікам, аб прыняцці дзяржавай безгаспадарных маёнткаў, аб прызнанні правоў уласнасці на зямлю, аб продажы зямлі прыватным асобам, справаздачы і справы аб парцэляцыі дзяржаўных і памешчыцкіх зямель, хутарызацыі сялянскіх гаспадарак, ліквідацыі сервітутаў, правядзенні землеўпарадкавальных работ, пратаколы пасяджэнняў ацэначнай камісіі па ўстанаўленні цэн зямельных участкаў, службовыя дзённікі і справаздачы землеўпарадчыкаў, рэестры абмеру зямель і інш. Таксама ёсць асабовыя справы служачых, спісы землеўладальнікаў, маёнткаў, якія былі прызначаны для парцэляцыі, вёсак, у якіх праводзілася хутарызацыя сялянскіх гаспадарак, тапаграфічныя планы вёсак і маёнткаў, журналы эксплікацыі, геадэзічных здымак [5, с. 112–114]. Для карыстальнікаў фонда маецца змест да вопісу 1, гісторыка-архіўная даведка, паказальнік відаў дакументаў, геаграфічны паказальнік. Ступень захаванасці дакументаў здавальняючая.

Кампетэнцыя павятовага зямельнага ўпраўлення распаўсюджвалася на адпаведны павет. Павятовыя зямельныя ўпраўленні (у 1921–1922 гг. – павятовыя зямельныя камісарыяты) у Палескім ваяводстве ствараліся адначасова з акруговым зямельным упраўленнем і падпарадкоўваліся яму. На тэрыторыі Палескага ваяводства дзейнічалі наступныя павятовыя зямельныя ўпраўленні: Брэсцкае, Драгічынскае, Камень-Кашырскае, Кобрынскае, Косаўскае, Лунінецкае, Пінскае, Пружанскае,

Сарненскае (да 1930 г.), Столінскае. Пры павятовых зямельных упраўленнях дзейнічалі камісіі, якія прызнавалі правы сялян на выкуп арандаванай зямлі. У Брэсцкім, Кобрынскім, Лунінецкім (з яго вылучыўся Столінскі), Пінскім, Пружанскім паветах з канца 1920 г. былі заснаваны павятовыя камітэты па надзяленні зямлёй асаднікаў (былых польскіх вайскоўцаў). Паводле распараджэння прэзідэнта Польшчы ад 27 кастрычніка 1933 г. павятовыя зямельныя ўпраўленні, камітэты па надзяленні зямлёй асаднікаў былі скасаваны, а іх функцыі перададзены павятовым старостам [4, с. 93–94].

Пры неабходнасці ў асобных гмінах ствараліся гмінныя зямельныя камісіі для вырашэння пытанняў, звязаных з аграрнай рэформай, аднак яны мелі дарадчыя функцыі, уключалі звычайна некалькі прадстаўнікоў гмінных радаў, якія добра ведалі становішча ў вёсках, характар аграрных адносін.

У ДАБр захоўваецца аб'яднаны архіўны фонд 372 (Поветовые земельные управления Полесского воеводства). У яго 9-ці вопісах налічваецца 1469 адзінак захавання (таксама польскамоўных). У 1950-я гг. адбывалася навукова-тэхнічная апрацоўка ў ДАБр (г. Брэст) дакументаў фондаў Брэсцкага, Кобрынскага, Косаўскага павятовых зямельных упраўленняў, у Дзяржаўным архіве Пінскай вобласці (г. Пінск) – дакументаў фондаў Драгічынскага, Лунінецкага, Пінскага, Пружанскага, Столінскага павятовых зямельных упраўленняў, а таксама Столінскага, Пінскага і Лунінецкага павятовых камітэтаў па надзяленні зямлёй асаднікаў, Пінскай і Столінскай камісій па прызнанні правоў сялян на выкуп зямлі (у 1966 г. яны перададзены ў ДАБр). У 1989 г. быў створаны аб'яднаны архіўны фонд з дакументаў фондаў 7 павятовых зямельных упраўленняў Палескага ваяводства, адбылася перадача на адкрытае захоўванне часткі спраў у выніку мэтавага рассакрэчвання, удасканаленне вопісаў, складзены 9 вопісаў, створаны навукова-даведачны апарат. Карыснымі для карыстальнікаў з'яўляюцца паказальнік груп дакументаў да ўсіх вопісаў, геаграфічны паказальнік да вопісаў 1-2.

Найбольшую колькасць адзінак захавання фонда 372 складаюць дакументы Брэсцкага павятовага зямельнага ўпраўлення. Вопіс 1 (745 спраў), утрымлівае цыркуляры, распараджэнні, інструкцыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і зямельных рэформаў Польшчы, Палескага акруговага зямельнага ўпраўлення, справаздачы аб дзейнасці павятовага зямельнага ўпраўлення, бюджэты і фінансавыя справаздачы, справы аб куплі зямлі, ліквідацыі сервітутаў, правядзенні парцэляцыі маёнткаў, хутарызацыі зямель, журналы ўліку зямельных участкаў, заявы грамадзян аб выдачы матэрыяльнай дапамогі і пазык, аб куплі зямельных участкаў і прызнанні права на выкуп зямлі, планы і справаздачы аб правядзенні каморніцкіх і землеўпарадкавальных работ, звесткі аб надзяленні зямлёй асаднікаў, статыстычныя звесткі аб памерах зямлі і колькасці землеўладальнікаў, аб стане пасеваў, ураджайнасці, цэнах на сельскагаспадарчую прадукцыю і інш. Вопіс 2 (108 адзінак захавання) таксама ўключае дакументы Брэсцкага павятовага зямельнага ўпраўлення і мае падобную з вопісам 1 іх відавую наменклатуру, праблемна-тэматычную накіраванасць.

Шэраг павятовых зямельных упраўленняў прадстаўлены нешматлікімі адзінкамі захавання. Так, вопіс 3 (Драгічынскае павятовае зямельнае ўпраўленне) уключае ўсяго 6 спраў, вопіс 4 (Кобрынскае павятовае зямельнае ўпраўленне) – 16 спраў, вопіс 5 (Косаўскае павятовае зямельнае ўпраўленне) – 4 справы, вопіс 6 (Лунінецкае павятовае зямельнае ўпраўленне) – 18 спраў. А дакументы Пружанскага павятовага зямельнага ўпраўлення (усяго 1 справа) наогул былі ўключаны ў аб'яднаны архіўны фонд 60.

Вопіс 7 (Пінскае павятовае зямельнае ўпраўленне) утрымлівае 223 справы – цыркуляры, рашэнні, распараджэнні, пратаколы, інструкцыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і зямельных рэформаў Польшчы, Палескага акруговага зямельнага ўпраўлення, акты аб выдачы зямлі, аб устанаўленні межаў маёнткаў, справы аб спагнанні запазычанасці за землеўпарадкавальныя работы, аб выдачы дазволаў на права продажу зямлі, аб куплі зямлі, пра землеўпарадкаванне маёнткаў, аб ліквідацыі сервітутаў, аб передачы зямель ва ўласнасць дзяржавы, аб правядзенні парцэляцыі маёнткаў, хутарызацыі зямель, дагаворы грамадзян аб куплі-продажы зямельных надзелаў, заявы грамадзян аб выдачы матэрыяльнай дапамогі і пазыкі, аб куплі зямельных участкаў і прызнанні права на выкуп зямлі, планы правядзення землеўпарадкавальных работ, рэестры абмеру зямель і інш.

Дакументы Столінскага павятовага зямельнага ўпраўлення знаходзяцца ў вопісах 8 і 9 фонда 372. Вопіс 8 (195 адзінак захавання) змяшчае цыркуляры, рашэнні, распараджэнні, інструкцыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і зямельных рэформаў Польшчы, Палескага акруговага зямельнага ўпраўлення, справаздачы і акты рэвізіі дзейнасці павятовага зямельнага ўпраўлення, бюджэты і фінансавыя справаздачы, справы аб куплі зямлі, ліквідацыі сервітутаў, правядзенні парцэляцыі маёнткаў, хутарызацыі зямель, дамовы грамадзян аб куплі-продажы зямельных надзелаў, аб здачы ў арэнду зямлі дзяржаўных маёнткаў, журналы ўліку выдадзеных пазык, заявы грамадзян аб выдачы матэрыяльнай дапамогі і пазыкі, аб куплі зямельных участкаў і прызнанні права на выкуп зямлі, планы і справаздачы аб правядзенні каморніцкіх і землеўпарадкавальных работ, статыстычныя звесткі аб стане пасеваў, ураджайнасці, цэнах на сельскагаспадарчую прадукцыю і інш. У вопісе 9 (154 адзінкі захавання) ёсць справы аб куплі зямлі ў Столінскім павеце.

Фонд 372 утрымлівае дакументы па асабоваму складу, спісы маёнткаў і хутароў, зямельных надзелаў і царкоўных зямель, асаднікаў, якія атрымалі зямлю і пазыку, сялян, каморнікаў і меліяратараў, картаграфічныя дакументы (планы маёнткаў і зямельных участкаў) [5, с. 113–114].

У цэлым, дакументальныя матэрыялы акруговага і павятовых зямельных упраўленняў Палескага ваяводства з'яўляюцца каштоўнымі крыніцамі не толькі па гісторыі сельскай гаспадаркі, аграрных адносін у Заходняй Беларусі, але і мікрагісторыі, гісторыі паўсядзённасці, генеалогіі.


1. Вабищевич, А. Документы Государственного архива Брестской области как источники по истории Польши периода между Первой и Второй мировыми войнами / А. Вабищевич // Wrocławskie studia wschodnie. – Nr 17. – Wrocław : Wydawnictwo Uniwersytetu Wroclawskiego, 2013. – S. 265–273.
2. Вабищевич, А. Н. Органы местного управления и самоуправления на территории Западной Беларуси / А. Н. Вабищевич // Органы местного управления и самоуправления на территории Беларуси (IX век – 30-е годы XX века) : пособие / Э. М. Савицкий [и др.] ; под общ. ред. С. Н. Ходина. – Минск : БГУ, 2019. – 205 с.
3. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2011. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2006. – 613 с.
4. Государственный архив Брестской области : путеводитель по фондам 1919–1939 / сост. : А. В. Теребунь [и др.] ; редкол.: А. Г. Карапузова (гл. ред.) [и др.]. – Брест : Альтернатива, 2010. – 130 с.
5. Polska-Białoruś. Wspólne dziedzictwo historyczne. Przewodnik po materiałach archiwalnych 1918–1939. – T. 1 : Archiwum Państwowe Obwodu Brzeskiego, Archiwum Państwowe Obwodu Grodzieńskiego / oprac. i red. naukowa: A. Wabiszczewicz [i in.]. – Warszawa : AMALKER, 2013. – 361 s.
6. Wabiszczewicz, A. Stan zachowania i charakterystyka materiałów dokumentalnych II Rzeczypospolitej w Archiwum Państwowym Obwodu Brzeskiego / A. Wabiszczewicz // Archeion. – T. CXVI. – Warszawa, 2015. – S. 370–384.


**Каплиев А.А.**

## ОБЩАЯ ХАРАКТЕРИСТИКА АРХИВНЫХ ФОНДОВ ПО ИСТОРИИ РАЗВИТИЯ ЗДРАВООХРАНЕНИЯ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ МЕЖВОЕННОГО ПЕРИОДА ИЗ СОБРАНИЯ ГОСУДАРСТВЕННОГО АРХИВА РОССИЙСКОЙ ФЕДЕРАЦИИ

Слабая разработанность вопросов развития здравоохранения межвоенного периода на территории Беларуси в отечественной историографии предопределяет необходимость анализа прежде всего первичных источников для выполнения качественного исследования по данной теме. Из числа первичных источников наибольший информационный потенциал принадлежит материалам архивов, однако фонды большинства областных и зональных архивов Беларуси, содержащие документы, характеризующие развитие здравоохранения, имеют следующую особенность: при довольно представительном комплексе делопроизводства за 1920-е годы отмечается отсутствие фондов, которые можно рассматривать как целостный массив материалов по организации здравоохранения в 1930-х годах до введения областного деления (1938 г.) [18, с. 154]. В этой связи особую значимость приобретает анализ документов зарубежных архивов, из которых крупнейшим в рамках разработки исследуемой темы является Государственный архив Российской Федерации в Москве (ГАРФ). Собрание ГАРФ включает около 7 млн единиц хранения, относящихся не только к истории России, но и других стран, в разные периоды бывших частями Российской империи и СССР [19]. Настоящая статья характеризует наиболее значимые фонды ГАРФ по истории развития здравоохранения на территории Беларуси в межвоенный период.

Превалирующей тенденцией в истории медицины Беларуси изучаемого периода являлось утверждение советской системы здравоохранения. Однако в годы революционной разрухи, германской оккупации белорусских земель и польско-советской войны 1919–1921 гг., а также в процессе преодоления их последствий в начале 1920-х годов определяющее влияние на развитие здравоохранения Советской Беларуси оказывал Народный комиссариат здравоохранения (НКЗ) РСФСР. Поэтому одним из основных фондов, характеризующих историю становления советского здравоохранения на территории Беларуси, является фонд А482 (Министерство здравоохранения РСФСР), насчитывающий 67 714 единиц хранения за 1918–1991 гг. [18, с. 297–301]. Фонд включает сотни дел, в той или иной степени относящихся к истории развития здравоохранения на территории Беларуси, в том числе в Витебской и Гомельской губерниях. Например, в фонде сохранились фактически полные копии или выписки из большинства приказов высших органов здравоохранения важнейшего периода становления советской медицины в Беларуси (Комиссариата здравоохранения Временного рабоче-крестьянского советского правительства Беларуси и ССР Беларуси (ССРБ), Минского губернского отдела здравоохранения, Народного комиссариата здравоохранения ССР Литвы и Беларуси (ЛитБел)), отсутствующие либо представленные лишь частично в «профильных» фондах Национального архива Республики Беларусь (ф. 46 – Министерство здравоохранения БССР и ф. 808 – Народный комиссариат здравоохранения ЛитБел) [3, л. 1–135; 4, л. 1–35 об.; 5, л. 1–30].